# Вайны свяшчэнныя старонкі навечна ў памяці людской




Вялікая Айчынная вайна

ў творах беларускіх пісьменнікаў

**70 гадоў мінула пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны.**

**70 гадоў вялікай Перамогі над фашызмам.**

Увесь гэты час беларускі народ свята захоўвае памяць герояў – тых, хто аддаў сваё жыццё ў барацьбе за свабоду і незалежнасць Радзімы. Пра вайну і яе герояў напісаны дзясяткі тысяч кніг. Аўтары кніг, прадстаўленых на выставе, як класікі беларускай літаратуры, так і сучаснікі, праўдзіва пішуць аб вайне. З кожным радком прачытанай кнігі адкрываюцца новыя старонкі гераічнага подзвігу народа. Жыве памяць у сэрцах нашых нашчадкаў!!! І нязгаснае святло Перамогі асвятляе нашы душы.



# Алесь Адамовіч, Янка Брыль, Уладзімір Калеснік

# «Я з вогненнай вёскі…»

Аўтары аб’ездзілі амаль усю Беларусь, запісалі ўспаміны жывых сведак карных аперацый фашыстаў. “Я з вогненнай вёскі…” — дакументальная трагедыя, кніга-памяць, жывы голас людзей, што былі спалены, забіты разам з сям’ёй, разам са сваёй вёскай, і якія — выжылі. Як у прадмове напісалі самі аўтары, у кнігу ўвайшлі ўспаміны толькі тых, якія самі перажылі жудасны лёс сваіх аднавяскоўцаў.



# Святлана Алексіевіч

Аповесць “У вайны не жаночае аблічча…”, напісаная ў жанры такіх вядомых твораў, як “Я з вогненнай вескі…”А. Адамовіча, Я.Брыля, У. Калесніка і “Блакадная кніга” А. Адамовіча і Д. Граніна – гэта амаль дзвесце споведзяў жанчын – франтавічак, падпольшчыц і партызанак. Мы чуем галасы жанчын, якія, прайшоўшы ўсе выпрабаванні жорсткага часу, засталіся жанчынамі.




Кніга С. Алексіевіч “Апошнія сведкі” — гэта ўспаміны пра вайну тых, каму ў той час было 6-12 гадоў. Пра вайну гавораць дзеці, не палітыкі, не салдаты і не гісторыкі. Ніхто і ніколі больш не раскажа нам так дакладна і пранікнёна пра гэта як яны -— апошнія сведкі. Вайна вачыма дзіцяці — самая страшная.



# Янка Брыль
# "Птушкі і гнёзды"

Раман задуманы як споведзь адной маладосці з заходнебеларускай вёскі. У цэнтры ўвагі пісьменніка лес Алеся Руневіча. Герой у пошуках Бацькаўшчыны прайшоў праз суровае змаганне супраць заняволення радзімы Польшчаю, праз фашысцкі палон, праз партызанскае змаганне за вызваленне свайго народа ад «карычневай» чумы. Менавіта праз успрыманне галоўнага героя перадаецца суровая праўда тых дзён, калі чалавецтва вяло змаганне супраць фашызму.



# Васіль Быкаў



Васіль Уладзіміравіч Быкаў нарадзіўся 19 чэрвеня 1924 г. у вёсцы Бычкі Ушацкага раёна ў сялянскай сям'і. Скончыўшы школу, паступіў на скульптурнае аддзяленне Віцебскага мастацкага вучылішча. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў складзе інжынернага батальёна ўдзельнічаў у будаўніцтве абаронных збудаванняў. Скончыў Саратаўскае пяхотнае вучылішча і з 1943 г. удзельнічаў у баях на 2-м і 3-м Украінскіх франтах. Быў двойчы паранены, ляжаў у шпіталях.

У 1944 г. бацькі В. Быкава атрымалі паведамленне, што іх сын мужна загінуў каля Кіраваграда (гэта было засведчана на абеліску). Але Быкаў выжыў і ваяваў далей. Пасля дэмабілізацыі працаваў мастаком у гродзенскіх майстэрнях, у рэдакцыі абласной газеты «Гродзенская праўда». Пазней быў супрацоўнікам і кансультантам газеты «Гродзенская праўда», сакратаром гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. У 1980 г. прысвоена званне Народнага пісьменніка Беларусі. За аповесць «Знак бяды» ў 1986 г. прысуджана Ленінская прэмія. Народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў памёр 22 чэрвеня 2003 года.

Вайна наклала глыбокі адбітак на творчасць В. Быкава, які прыйшоў у літаратуру з палымяным жаданнем расказаць пра яе жахі ад імя цэлага пакалення, ад імя тых дзевяноста сямі працэнтаў сваіх равеснікаў, якія загінулі, не вярнуліся з крывавых палеткаў вайны. Галоўнай тэмай твораў Васіля Быкава з'яўляецца франтавое жыццё, партызанская і падпольная барацьба беларускага народа супраць фашысцкіх захопнікаў.

Гэтай тэме прысвечаны «Жураўліны крык» (1960), «Трэцяя ракета» (1962), «Альпійская балада» (1963), «Круглянскі мост» (1968), «Сотнікаў» (1970), «Абеліск» (1971), «Дажыць да світання» (1973), «Воўчая зграя» (1974), «Пайсці і не вярнуцца» (1978), «Знак бяды» (1982), «Кар'ер» (1986), «Сцюжа» (1991). Станоўчыя героі гэтых твораў у жорсткіх умовах вайны трапляюць у такія сітуацыі, калі неабходна праявіць мужнасць, непакорнасць. Для іх паняцці чалавечай сумленнасці, справядлівасці, адказнасці перад людзьмі вышэй за жыццё.



Аповесць В. Быкава “У тумане” прысвечана партызанам. Разведчыкі Бураў і Войцік павінны абясшкодзіць чалавека, які быццам служыць фашыстам. Пра цяжкі паход і рассказваецца ў творы.

У аповесці “Знак бяды” распавядаецца пра трагічны лес жыхароў хутара Яхімоўшчыны – Сцепаніды і Петрака Багацькаў. У жыцці гэтых людзей адлюстраваны тыя нягоды, якія выпалі на долю беларускага народа, яго барацьба з фашысцкімі акупантамі ў час Вялікай Айчыннай вайны.

У рамане ”Кар’ер” галоўны герой твора, камандзір Чырвонай Арміі Агееў па волі франтавога лесу апынаецца ў невялікім мястэчку на поўдні Беларусі. Цяжка паранены, ён змушаны пайсці ў падполле, каб зноў змагацца з фашыстамі.






# Міхась Лынькоў “Векапомныя дні”

Усенародную партызанскую барацьбу паказвае М. Лынькоў у рамане-эпапеі «Векапомныя дні» (1948—1958). Гэта самы маштабны ў беларускай літаратуры твор аб партызанскай вайне на тэрыторыі Беларусі. Пісьменнік стварыў эпічныя вобразы радавых байцоў і кіраўнікоў партызанскага руху і падполля. Разам узятыя, героі рамана ствараюць калектыўны вобраз народа-змагара, які не зламаўся, не стаў на калені перад ворагам.



# Андрэй Макаёнак “Трыбунал”






У трагікамедыі “Трыбунал” драматург зрабіў спробу глянуць на падзеі вайны праз прызму камедыйнага жанру. Галоўны герой Цярэшка раптоўна вырашыў стаць самазваным падпольшчыкам, добраахвотна пайшоў на службу старастам да немцаў, чым выклікаў востры недавер да сябе сям’і, якая наладзіла сямейны трыбунал. Гэты канфлікт прывеў да трагедыі.

# Іван Мележ
# “Мінскі напрамак”

У рамане «Мінскі напрамак» паказана вызваленне Беларусі воінамі Чырвонай Арміі і партызанамі ў красавіку — ліпені 1944 года. Раман вызначаецца шырынёй ахопу падзей, багаццем жыццёвага матэрыялу, шматпланавасцю і панарамнасцю, вялікай колькасцю персанажаў, прасякнуты адчуваннем велічы і маштабнасці дасягнутай перамогі. У творы па-мастацку праўдзіва, пераканаўча выведзены вобраз камандуючага 3-м Беларускім фронтам генерала арміі Івана Данілавіча Чарняхоўскага. Ён паказаны як выдатны палкаводзец, чулы чалавек, добры сем’янін.






# Іван Навуменка

Ваенная трылогія І.Навуменкі складаецца з раманаў: "Сасна пры дарозе", "Вецер у соснах" і "Сорак трэці". У трылогіі праўдзіва паказана барацьба партызан і падпольшчыкаў на палескай зямлі супраць фашысцкіх захопнікаў. Героі твора – хлопцы і дзяўчаты, на долю якіх выпалі цяжкія выпрабаванні.

Застаўшыся пад акупацыяй, Міця Птах і яго сябры ствараюць падпольную групу без якога-небудзь кіраўніцтва зверху, адчуваючы сваю асабістую адказнасць за будучае, за лёс роднай зямлі.



# Іван Пташнікаў

Аповесць “Найдорф” расказвае аб апошняй блакадзе карнікаў у адным з партызанскіх раёнаў Беларусі і аб першых пасляваенных днях, калі ў спаленыя вескі вярталіся людзі. Найдорф — назва і беларускай, і нямецкай вёскі. Гэта сімвал таго новага жыцця, якое павінна наступіць пасля вайны.







Аповесць “Тартак” аб трагічным лёсе беларускай вескі Дальвы, якую разам з жыхарамі спалілі фашысты ў час Вялікай Айчыннай вайны.

# Лявонцій Ракоўскі “Канстанцін Заслонаў”







Аповесць Л. Ракоўскага распавядае пра выдатнага сына Беларусі Канстанціна Заслонава, пра гераічных беларускіх партызан.

# Алесь Савіцкі

Трылогія складаецца з раманаў «Верай і праўдай», «Літасці не чакай», «Памерці заўсёды паспееш». Гэта маштабнае мастацкае палатно пра сям’ю рабочага-палачаніна Елісея Крупні, якая прайшла праз ваенныя выпрабаванні.









# Барыс Сачанка

У рамане "Чужое неба" Б.Сачанка імкнуўся паглыбіць праўду пра вайну. Ён расказаў пра лёс людзей у выгнанні, стварыў дакладную і драматычную карціну чалавечага існавання пад чужым небам.







Раман-трылогія "Вялікі Лес" ахоплівае складаны перыяд жыцця жыхароў вёскі Вялікі Лес. Твор гэты глыбокі і арыгінальны. Пісьменнік стварыў у ім цэлую галерэю цікавых персанажаў, як станоўчых, так і адмоўных.

# Кузьма Чорны

Лепшай прозай у беларускай літаратуры пад час вайны былі раманы Кузьмы Чорнага “Пошукі будучыні”, “Вялікі дзень”, “Млечны шлях”. У іх паэтызуецца беларус-змагар і працаўнік, які ўпрыгожвае садамі зямлю, умее быць смелым у баях, верным у дружбе і ў каханні.

Гэтыя творы аб вялікай любві кожнага нашага чалавека да роднай зямлі, аб тым, як савецкі народ выявіў лепшыя якасці сваёй душы ў гады Вялікай Айчыннай вайны.



# Іван Чыгрынаў
# “Плач перапёлкі”

Раман "Плач перапёлкі” – першы твор з цыкла раманаў аб Вялікай Айчыннай вайне І. Чыгрынава. У ім аўтар усхвалявана апавядае пра боль і пакуты, якія нясе людзям вайна, пра волю і мужнасць, праяўленую людзьмі на вайне.



# Іван Шамякін




У рамане “Вазьму твой боль” у цэнтры аўтарскай увагі расказ пра лёс таго пакалення беларусаў, якое ў час вайны было дзецьмі. Але яшчэ доўга ваенная трагедыя адгукаецца ў жыцці людзей і нярэдка ломіць іх шчасце.

Раман ”Глыбокая плынь” - гэта праўдзівае адлюстраванне жыццёвых праблем, якія ўзнікалі перад людзьмі, што заставаліся на акупіраванай тэрыторыі і вялі партызанскую барацьбу з ворагам.



# Ішла вайна народная

У зборнік увайшлі апавяданні беларускіх пісьменнікаў розных пакаленняў. Праўдзіва і шчыра тут паказаны гераічная барацьба савецкіх воінаў, масавы партызанскі рух, мужнасць і стойкасць мірнага насельніцтва, тытанічны подзвіг савецкіх людзей у вялікім усенародным змаганні супраць фашызму.



# Памяць сэрца




Літаратурны зборнік “Памяць сэрца” – калектыўная праца беларускіх і расійскіх пісьменнікаў. Кніга прысвячаецца падзеям Вялікай Айчаннай вайны, гераічнаму подзвігу беларускага і рускіх народаў. У зборніку змешчаны творы пісьменнікаў старэйшага пакалення – удзельнікаў вайны, пасляваеннага пакалення і маладых празаікаў. Аўтары расказваюць аб падзеях вайны, аб лёсах сваіх бацькоў і дзядоў.

**Каб ніколі, каб ніколі**
**Не спазналі мы ваеннай долі,**
**Хай гараць, як зоркі ў вышыні,**
**Перамогі вечныя агні.**

*А. Грачанікаў*



# Бібліяграфія

1. Адамовіч, А.  Я з вогненнай вёскі / А. Адамовіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1983. — 439 с.
2. Алексіевіч, С. А. Апошнія сведкі : кніга недзіцячых расказаў / С. А. Алексіевіч. — Мінск : Юнацтва, 1985. — 189 с.
3. Быкаў В. У. Збор твораў: у 6 т. / В. У. Быкаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. — 547 с.
4. Быкаў, В. У. У тумане : аповесці / В. У. Быкаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. — 384 с.
5. Ішла вайна народная : апавяданні аб Вялікай Айчыннай вайне. — Мінск : Народная асвета, 1975. — 304 с. — (Школьная бібліятэка) .
6. Лынькоў М. Збор твораў : у 8 т. / М. Лынькоў. — Мінск : Навука і тэхніка, 1983. — 671 с.
7. Макаёнак А. Е. Збор твораў : у 5 т. / А. Е. Макаёнак. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1987. — 367 с.
8. Мележ І. П. Збор твораў : у 10 т. / І. П. Мележ. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1980. — 416 с.
9. Навуменка І. Я. Збор твораў : у 6 т. / І. Я. Навуменка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1983. — 567 с.

10. Памяць сэрца = Память сердца : апавяданні беларус. і рас. пісьмен. [склад.: А. В. Варанцоў, А. К. Кажадуб, Г. М. Малей] — Мінск : Бел. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. — 783 с.
11. Ракоўскі Л. О. Канстанцін Заслонаў : аповесць / Л. О. Ракоўскі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1976. — 272 с.
12. Савіцкі А. А. Верай і праўдай : раман / А. А. Савіцкі. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1976. — 416 с.
13. Савіцкі А. А. Літасці не чакай : раман / А. А. Савіцкі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1982. — 398 с.
14. Савіцкі А. А. Памерці заўсёды паспееш : раман / А. А. Савіцкі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1983. — 344 с.
15. Сачанка Б. І. Вялікі лес : раман: у 3-х кн. / Б. І. Сачанка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1982. — 336 с.
16. Чорны К. Збор твораў : у 6 т. / К. Чорны. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. — 462 с.
17. Чыгрынаў І. Г. Плач перапёлкі : раман / І. Г. Чыгрынаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1978. — 304 с.
18. Чыгрынаў І. Г. Свае і чужынцы : раман / І. Г. Чыгрынаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1984. — 367 с.
19. Шамякін І. П. Вазьму твой боль : раман / І. П. Шамякін. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1979. — 384 с.

20. Алексиевич С. А. У войны не женское лицо / С. А. Алексиевич. — Минск : Мастацкая літаратура, 1985. — 317 с.
21. Брыль Я. Птицы и гнезда : книга одной молодости / Я. Брыль ; авториз. gep. с белорусского А. Островского. — Москва : Советский писатель, 1975. — 342 с .
22. Быков В. В. Знак беды ; Карьер : повесть, роман / В. В. Быков. — Минск : Мастацкая літаратура, 1989. — 542 с. — (Белорус. проза) .
23. Мележ И. П. Минское направление : роман / И. П. Мележ ; авториз. пер. с белорус. Л. Раковского. — Минск : Художественная литература, 1963. — 696 с.
24. Пташников И. Н. Найдорф : повести / И. Н. Пташников. — Минск : Юнацтва, 1989. — 416 с. — (Б-ка юношества).
25. Саченко Б. И. Чужое небо : роман в новеллах / Б. И. Саченко ; авториз. пер. с белорус. А. Чесноковой. — Минск : Мастацкая літаратура, 1979. — 368 с.



# ДЗЯКУЕМ ЗА ЎВАГУ!

Супрацоўнікі аддзела даведачна-бібліяграфічнай і інфармацыйнай работы бібліятэкі ГДТУ ім. П.В.Сухога

ліпень 2015